Тэст на ўроку

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА

## АПОВЕСЦЬ "У ПАЛЕСКАЙ ГЛУШЫ" (IX КЛАС)

**1.** Што з уласнага жыцця перанёс аўтар на старонкі твора?

а) Гады дзяцінства і юнацтва, навучанне ў дарэктара, вучоба ў Нясвіжскай семінарыі.

б) Андрэй Лабановіч у трылогіі паўтарае шлях Якуба Коласа: настаўніцтва на Палессі, удзел у сялянскіх хваляваннях, удзел у настаўніцкім з'ездзе, звальненне з працы…

в) На старонкі твора аўтар перанёс факт сваёй работы ў АН Беларусі на пасадзе віцэпрэзідэнта.

г) Лабановіч падобны да Я. Коласа не толькі знешняй, але і ўнутранай біяграфіяй, складам душы, схільнасцю да аналітызму.

д) Большасць герояў мае прататыпы, якія выступаюць пад сваімі ці змененымі імёнамі. Я. Колас дакладны ў перадачы мясцовых назваў Палесся, дзе ён працаваў.

**2.** "Для чаго чалавек жыве на зямлі?" – з гэтым асноўным хвалюючым пытаннем малады настаўнік звяртаецца да…

а) свайго калегі – настаўніка Саханюка;

б) айца Кірыла;

в) школьнай старожкі бабкі Мар'і;

г) таварыша па семінарыі, настаўніка Турсевіча;

д) бацькі Ядвісі пана Баранкевіча.

**3.** Андрэй Лабановіч – малады чалавек, таму натуральна, што ён неабыякавы да дзяўчат. Што цэніць ён у іх?

а) Знешняе хараство, вясёлы характар, шчырасць, непасрэднасць, гарэзлівасць.

б) Лабановіч – практычны чалавек, і ён выбірае дзяўчыну з дастаткам, яго перш за ўсё цікавіць маёмасны стан яе сям'і.

в) Яго прываблiваюць дзяўчаты, якія патрабуюць кампліментаў ад хлопцаў, увагі.

г) Яго хвалюе знешняе дзявочае хараство, але яно не з'яўляецца вызначальным, падабаюцца дзяўчаты з багатым духоўным светам, шырокімі інтарэсамі.

д) Дзявочую гордасць і годнасць, паэтычнасць натуры, загадкавасць.

**4.** Ці кахалі адно аднаго Ядвіся і Андрэй?

а) Ядвісю і Андрэя збліжалі агульныя погляды, крытычнае стаўленне да асяроддзя інтэлігентаў, у якім жылі. Яны больш аднадумцы, сябры.

б) І Лабановічам, і Ядвісяй кіраваў разлік, а не каханне. Для Лабановіча з'явілася магчымасць увайсці ў больш высокае ў сацыяльным плане асяроддзе. Для Ядвісі – магчымасць пакінуць ненавісны бацькоўскі дом, каб не бачыць дзікунства бацькі, якое нагадвала пра смерць маці.

в) Кахалі, бо было шчасце прызнання ў каханні і першы пацалунак, было і жаданне адпомсціць адно аднаму.

г) Маладыя людзі пакахалі адно аднаго, прагнулі сустрэч, раўнавалі (Ядвіся – Лабановіча да Людмілы, той – дачку падлоўчага да Сухаварава).

**5.** Чаму разышліся дарогі Лабановіча і Ядвісі?

а) Паміж імі не было ўзаемнага пачуцця. Кахала толькі Ядвіся, Лабановіч – не. Таму ён і не прапанаваў ёй руку і сэрца.

б) Яны былі маладыя і не ўмелі шанаваць кахання.

в) Яны абое баяліся, што сям'я стрымае, калі зусім не згасіць, парывы да высокіх ідэалаў, паўнавартаснага грамадскага жыцця.

г) Перашкодай да шчасця былі іх бацькі. І з аднаго, і з другога боку не хацелі радніцца, не бачылі шчаслівай сямейнай перспектывы.

д) Лабановіч – сын селяніна. Ён баяўся прызнацца Ядвісі ў каханні і пачуць ад яе, што ён ёй не пара.

е) У Лабановіча было толькі захапленне Ядвісяй, а глыбокага кахання не было. Толькі страціўшы дзяўчыну, ён зразумеў, кім яна была для яго, як збяднілася яго жыццё, бо не стала таго, перад кім хацелася жыць годна, узвышацца над "балотам".

**6.** Які сэнс назвы аповесці?

а) Першая аповесць трылогіі мае назву "У палескай глушы", бо дзеянне адбываецца сапраўды ў вельмі глухой вёсачцы, сярод лясоў і балот.

б) Назва мае шырокі сэнс. Ідзе размова не толькі пра геаграфічную, але і духоўную глуш, калі жыццё марнуецца на карты, п'янкі, нікчэмныя забавы, калі чалавека чакае грамадзянская смерць.

в) Назва гэта іранічная. Ніякая гэта не глуш, бо там праходзіла чыгунка.

г) Геаграфічная глуш давала магчымасць Лабановічу самарэалізавацца як педагогу, інтэлігенту, нішто яму не замінала быць самім сабой.

**7.** На першых старонках аповесці Лабановіч спрачаецца з айцом Кірылам па пытаннях:

а) рэлігіі і атэізму, біблейскіх тэкстаў;

б) ці павінна ў школе выкладацца Слова Божае і якім чынам размеркаваць вучэбную нагрузку ў малакамплектнай школе;

в) як глядзець на мужыка, чаму мужык жыве ў цемры і ў брудзе;

г) падзення маралі ў народзе ў выніку адсутнасці сапраўднай веры;

д) ці трэба паважаць мужыка, заступацца за яго, бараніць яго інтарэсы.

**8.** У аповесці "У палескай глушы" ёсць наступныя эпізоды:

а) Андрэй Лабановіч шчыра і самаахвярна вучыць мужыка Аксёна Каля чытаць і пісаць;

б) галоўны герой знаёміцца з рэвалюцыянеркай-эсэркай Вольгай Андросавай;

в) няўдала мірыць двух сялян, якія пабіліся з-за знойдзенай юшкі (засаўкі для печы). Аднаму з іх дае рубель;

г) настаўнік садзіць на школьным двары разам з вучнямі грушку-дзічку;

д) едзе з найлепшымі вучнямі на экзамены;

е) дзяк Бацяноўскі "замяшчае" ў школе папа, выкладае Закон Божы.

**9.** Аднойчы бабка Мар'я…

а) паставіла на "канвеер" выраб "святой вады". Спагадлівая жанчына разбаўляла "святую ваду" вадой з калодзежа;

б) зламала грушку-дзічку на школьным двары, бо хацела пасадзіць культурнае дрэўца і гэтым дагадзіць настаўніку;

в) з насцярогай і абурэннем паставілася да візіту Саханюка да Лабановіча, не хацела частаваць такога госця;

г) кінула ў фортку запіску да настаўніка, у якой паведамлялася, што Андрэя чакае ва ўмоўленым месцы Ядвіся.

**10.** Настаўнік Саханюк прыязджае ў Цельшына, каб…

а) даваць прыватныя ўрокі дзецям з малазабяспечаных сем'яў;

б) збіраць т. зв. гарцы – плату за навучанне дзяцей у школе;

в) навучыцца новым метадам выкладання ў Лабановіча, пагутарыць пра сам працэс навучання;

г) прачытаць сялянам лекцыю пра неабходнасць будаўніцтва грэблі на балоце.

**11.** Якія рысы характару ўласцівыя бацьку Ядвісі?

а) інтэлігентнасць;

б) ганарыстасць;

в) жорсткасць;

г) бестактоўнасць;

д) любоў да блізкіх і родных;

е) чуллівасць і далікатнасць;

ё) уладалюбства.

**12.** Андрэй Лабановіч едзе з Цельшына да валаснога начальства ў…

а) Верхань;

б) Выганы;

в) Хатовічы;

г) Панямонь.

**13.** Колас параўноўвае Ядвісю з…

а) ластавачкай;

б) палахлівай сарнай;

в) бярозкай;

г) грушкай-дзічкай;

д) спуджанай дзікай птушкай;

е) зорачкай.

**14.** Бярэ плату за пісьмы з бедных салдатак…

а) Янка Тукала;

б) Турсевіч;

в) айцец Кірыл;

г) Саханюк;

д) Дубейка.

**15.** Да каго цельшынскі настаўнік піша ліст, ужываючы наступныя выразы: "як муха пад калпаком", "у балоце", "грамадзянская смерць", "не хачу зрабіцца вахлаком"?

а) да Турсевіча;

б) да сваіх бацькоў;

в) да Янкі Тукалы;

г) да Алеся Садовіча;

д) да Ядвісі.

**16.** Малады настаўнік пачынае рэалізоўваць сваю праграму па асвеце народа з…

а) патрабаванняў да ўлады аб паляпшэнні ўмоў навучання ў Цельшынскай школе;

б) арганізацыі дашкольнага навучання і выхавання ў Цельшыне;

в) наведвання сялянскіх хат, яго цікавіла, як і чым жывуць вяскоўцы;

г) таго, што сабраў сялян у школе і пачаў чытаць ім лекцыі;

д) правядзення сумесных вячорак з цельшынцамі.

**17.** Лабановіч у гонар Ядвісі…

а) зладзіў з вучнямі канцэрт;

б) наладзіў застолле, каб паказаць Ядвісі шырыню натуры і шчодрасць;

в) пасадзіў грушку-дзічку на школьным двары;

г) намаляваў яе партрэт на школьнай дошцы;

д) напісаў верш-прысвячэнне.

**18.** Настаўнік Турсевіч і Лабановіч у час знаёмітай сустрэчы…

а) гутараць пра засілле бюракратызму, схаластыку і дагматызм у настаўніцкай працы;

б) выказваюць свае жыццёвыя планы і мары;

в) абмяркоўваюць дзяўчат;

г) вырашаюць, дзе і калі правесці настаўніцкі сход;

д) разважаюць пра беларускі нацыянальны характар;

е) гавораць пра ролю інтэлігенцыі ў грамадстве.

**19.** Аповесць была напісана Коласам у…

а) 1920 – 1923 гг.;

б) 1921 – 1922 гг.;

в) 1930 – 1939 гг.;

г) 1948 – 1954 гг.

**20.** "Як смутна і тужліва пазіраюць гэтыя шкляныя вочы пустой і мёртвай кватэры! І дарэмна гэты малады бліскучы месячык стараецца ажывіць пагаслыя вочы: яны свецяцца, а жыцця няма". Цытата належыць…

а) Лабановічу, які глядзіць на дом Ядвісі, калі яе ўжо няма там;

б) Ядвісі, гэта яе развітальны вечар, і яна глядзіць на школу;

в) аўтару, які так разважае пасля таго, як Цельшына пакідаюць і Ядвіся, і Андрэй.

**АДКАЗЫ**

**1** – б, г, д; **2** – в, г; **3** – а, г, д; **4** – в, г; **5** – б, в, д, е; **6** – а, б, г; **7** – в, д; **8** – в, г, д; **9** – а, в; **10** – б; **11** – б, г, в, ё; **12** – в; **13** – б, г; **14** – г; **15** – в; **16** – в, г; **17** – в; **18** – а, б, д, е; **19** – б; **20** – б.

## ПАЭМА "СЫМОН-МУЗЫКА" (X КЛАС)

### ПЕРШАЯ ЧАСТКА

**1.** З першых старонак паэмы Сымонка характарызуецца як хлопчык…

а) чуллівы;

б) уражлівы;

в) палахлівы;

г) летуценны;

д) нястрыманы;

е) гарэзлівы;

ё) дапытлівы.

**2.** Сымонка любіў бавіць час…

а) дома, у роднай хаце, з маці і бацькам;

б) на ўлонні прыроды, у полі;

в) на марскім беразе, слухаючы чаек;

г) у гульнях з аднагодкамі, на вуліцы;

д) у адзіноце, слухаючы гукі прыроды.

**3.** Перад кім Сымонка ўпершыню адкрыў душу?

а) перад маці і бацькам;

б) перад сябрам, суседскім хлопчыкам;

в) перад дзедам Курылам;

г) перад дзедам Данілам;

д) перад музыкантам Галыгам.

**4.** Хто першы заўважыў талент Сымонкі, загаварыў пра вучобу, кнігу?

а) музыкант Галыга;

б) дзед Даніла;

в) дзед Курыла;

г) дзед-жабрак;

д) родны бацька.

**5.** Дзед Курыла падарыў таленавітаму хлопцу…

а) віяланчэль;

б) дудку-весялушку;

в) скрыпачку;

г) бубен;

д) балалайку.

**6.** Ці важна, у якой сям'і нарадзіўся наш герой?

а) Не, не важна, бо на яго талент сям'я ніяк не паўплывала.

б) Вельмі важна, бо нарадзіўся ў беднай сям'і, а талент яго не было каму заўважыць, развіць.

в) Важна, таму што ў беднай сям'і патрэбен быў хлопец умелы, практычны, гаспадарлівы.

**7.** Сымон схільны да філасофскіх разважанняў. Гэта пацвярджаюць…

а) пытанні, якія ён задаваў дзеду Курылу: "Ці чуе зямля боль?", "Адкуль усё бярэцца?" і інш.

б) яго думкі наконт непадобнасці дрэў у лесе;

в) развагі пра таямнічыя гукі прарочага звона;

г) яго роздум пра жыццё і смерць, пра душу чалавека пасля смерці дзеда Курылы.

**8.** Як духоўны запавет і ўдзячнасць таленавітаму хлопцу ўспрымаецца развітальны падарунак дзеда Курылы. Гэта…

а) сямiструнная гітара;

б) залатыя манеты-талеры;

в) новая пастушковая пуга;

г) новыя боты і плашч;

д) скрыпка.

**9.** Як падарунак дзеда Курылы змяніў жыццё хлопца?

а) На Сымона глядзелі неяк ласкавей, усе запрашалі пайграць на вечарынках, на святах.

б) Сымон паступае ў музычную школу, яму выплочваюць стыпендыю.

в) Разам з іншымі музыкамі Сымон арганізаваў квартэт, з якім ездзіў на гастролі.

г) Дома да Сымона пачалі ставіцца з павагай, марылі, што талент хлопца дапаможа сям'і, прынясе капейку ў хату.

**10.** Хлопец пакідае родны дом. Ён у выгнанні. Па якой прычыне?

а) Сымонка шмат зарабляў граннем, але ўсе грошы не аддаваў, бо збіраў на паступленне ў кансерваторыю.

б) Аднойчы гуляў з агнём і ледзь не спаліў хату, яго і выгналі.

в) Сымонка сам чакаў зручнага выпадку, каб збегчы з хаты, дзе яго папракалі куском хлеба.

г) Ён не ўратаваў авечы гурт ад ваўкоў, хоць і крычаў, клікаў на дапамогу.

д) На пашы Сымонка зноў аддаўся сваім марам, заснуў, а авечак скралі злодзеі.

### ДРУГАЯ ЧАСТКА

**1.** З кім або чым Я. Колас параўноўвае Сымонку ў выгнанні?

а) Са звонам, які імкнецца граць на карысць людзям, абуджаць іх.

б) З жаўруком, што спявае ў полі, кліча вясну.

в) З сонечным промнем, які заблукаў сярод хмар.

**2.** Хлопчык ідзе на могілкі, да магілы дзеда Курылы. Там ён…

а) плача, згадваючы спагадлівага, добрага дзядулю, які адзіны яго разумеў;

б) хоча перачакаць навальніцу ў старым склепе;

в) заснуў нарэшце ў знямозе і стоме і ў сне ўбачыў дзеда, пачуў сумныя спевы, мелодыю.

**3.** Хлопец гоніць ад сябе думку вярнуцца дадому, бо…

а) баіцца новага пакарання бацькоў;

б) ён не знойдзе ўжо дарогі дадому, таму што заблукаў вандруючы;

в) не хоча "здзек цярпець і спіну гнуць";

г) воля і свабода даражэйшыя за ўсё.

**4.** Сымон здарожыўся, стаміўся, трэба падсілкавацца. Дзеля гэтага ён…

а) пачуўшы пах блінцоў каля адной вёскі, просіцца ў хату на начлег;

б) ідзе ў прыдарожную карчму;

в) просіць міласціну на паперці;

г) вырашае накапаць у полі бульбы, раскласці вогнішча, напячы бульбы і падсілкавацца.

**5.** Чаму падарожны жабрак кліча Сымона хадзіць па вёсках і жабраваць?

а) Гэта чалавек літасцівы і чуллівы, ён не мог кінуць у бядзе хлопца.

б) Жабрак зразумеў, пачуўшы гранне хлопца, што яго можна выкарыстаць, людзі будуць больш падаваць.

в) Жабрак быў ужо стары, і ў яго нікога не было з родных, ён хацеў пакінуць хлопцу сваю маёмасць у спадчыну.

**6.** Сымонка і дзед-жабрак зараблялі на жыццё наступным чынам:

а) дзед спяваў жабрацкія песні, а музыка яму акампанаваў, грошы людзі кідалі ў торбу ці шапку дзеда;

б) Сымонка граў асобна ад дзеда, а потым яны сустракаліся і дзялілі набытае;

в) дзеду мала чаго патрэбна было ў жыцці, і ён клапаціўся пра Сымона, аддаваў яму ўсё смачнае, нават справіў новае адзенне.

**7.** У дзеда-жабрака была ўласная філасофія жыцця, у аснове якой наступныя перакананні:

а) трэба паважаць людзей, ставіцца да іх з павагай, па-добраму, быць шчырым;

б) хоць і быць жабраком, але любіць і шанаваць волю, свабоду, не скарацца цяжкасцям жыцця;

в) у грамадстве трэба ведаць сваё месца, жабрак заўсёды павінен мець жабрачы выгляд і жаданні;

г) трэба быць "зверам сярод звяроў", а "між авечачак – ягняткам".

**8.** Што апісана аўтарам у наступных радках паэмы і якая роля гэтага апісання: "…і варушацца клубы іх, / Як жывыя, / І сівыя, / Нібы галавы на шыях / Нейкіх волатаў дзіўных, / З багна неба насланых, / Ды, як змей многагаловы, / Націскаюцца цяжэй; / Глушыць землю шум іх мовы…"?

а) Гэта апісанне навальніцы. Яно папярэднічае важным зменам у жыцці Сымона – знаёмству з Ганнай.

б) Гэта ўрывак з казкі, пачутай аднойчы Сымонам ад дзеда Курылы. Яна [казка] прадвяшчае хуткі палон хлопца.

**9.** Аднойчы ўражлівы Сымонка расчуліўся і заплакаў. Па якой прычыне?

а) У лесе, калі ўцёк ад дзеда-жабрака.

б) Над ракой, пад ніцымі вербамі, калі прыгадаў сваю родную вёску, бацькоў.

в) У сялянскай хаце, калі зайшоў туды разам з дзедам, каб перачакаць навальніцу. Хлопцу стала сорамна: гаспадар вінаваціў яго за тое, што збег з бацькоўскай хаты.

**10.** Чаму Сымону не спіцца на сенавале?

а) Хоча дачакацца, пакуль засне жабрак, каб уцячы.

б) Ён уражаны прыгажосцю ночы пасля навальніцы, рукі яго самі цягнуцца да скрыпкі.

в) Сымонка згадвае дзяўчыну Ганю, якая з цікавасцю слухала яго гранне яшчэ ў хаце. Вобраз яе, "нібы зорачка ў тумане", вабіў і клікаў.

### ТРЭЦЯЯ ЧАСТКА

**1.** Якія новыя матывы лірыкі дамінуюць у аўтарскім адступленні на пачатку 3-й часткі? (Адказы даюцца вучнямі пасля слухання пэўнага ўрыўка.)

а) "Гэй, адвечныя курганы, / Сведкі прошласці глухой! / Кім вы тут панасыпаны?" (*Матывы сівой мінуўшчыны, гісторыі Беларусі.*)

б) "Дзе ж у свеце / Край другі такі знайсці, / Дзе б магла так, поруч з смеццем, / Гожасць пышная расці?" (*Матывы кантрасту, сацыяльнай няроўнасці.*)

в) «З двух бакоў "айцы" дубінай / Заганялі нас у рай! / Кроў лілася ручаямі, / Здрада чорная расла, / Што панамі і ксяндзамі / Ў сэрцы кінута была». (*Падзел краіны на заходнюю і ўсходнюю часткі.*)

г) "І без жалю капытамі / Конь казацкі тут ступаў, / І збажынку з ярынамі / Талачыў і драсаваў". (*Прыгнёт Расійскай імперыі.*)

**2.** Галоўны герой пасля ўцёкаў ад дзеда-жабрака і развітання з Ганнай прыблукаў…

а) у родны дом;

б) у Вільню;

в) на чыгуначную станцыю;

г) у карчму.

**3.** Чаму карчма Шлёмы была папулярная ў наваколлі?

а) Шлёма прымаў за грошы ўсіх: і сялян, і шляхцічаў.

б) Мог даць пітво і ежу напавер.

в) Карчмар даваў слушныя парады наведвальнікам.

г) Бясплатна і без выгоды для сябе мог прыняць чалавека.

**4.** Чым займаўся Сымон у карчме?

а) Вучыўся грамаце ў мясцовага дарэктара.

б) З раніцы да вечара ўдасканальваў сваё майстэрства грання на скрыпцы.

в) Па загадзе Шлёмы займаўся гаспадарчымі справамі.

г) Іншы раз граў для заезджых паноў.

д) Часам крыўдаваў на сыноў Шлёмы – Хаіма і Абрама, – якія без дазволу бралі скрыпку.

е) Цярпеў незлаблівыя кпіны Яхіма – хлопца пры кухні.

ё) "Вызваляе скрыпку з палону".

ж) Піша лісты да каханай Ганны.

**5.** Як узбагаціўся талент хлопца ў гэты час? Ці на карысць пайшло жыццё ў карчме?

а) Так, безумоўна. Хлопец шмат чаму навучыўся: весці гаспадарку, падаваць на стол і інш.

б) Канечне, ён мог навучыцца ў Шлёмы камерцыі. Сымонка хацеў стаць карчмаром.

в) Сымонка ў карчме сабраў неабходныя для паступлення ў кансерваторыю грошы.

г) Талент яго толькі марнаваўся, Сымонка вымушаны быў займацца чорнай работай.

д) Шлёма не клапаціўся пра творчы рост маладога музыкі, нават забіраў у яго скрыпку.

**6.** Перад тым як уцячы з карчмы, Сымонка…

а) "ратуе" сваю скрыпку, якую замкнуў у шафе Шлёма;

б) прадае скрыпку, каб былі грошы на далейшае падарожжа;

в) абдумвае план уцёкаў;

г) дазнаецца, што ад Шлёмы, звёўшы каня, уцёк Яхім;

д) выводзіць уначы каня са стойла;

е) назапашвае харчы.

**7.** Пры якіх абставінах адбылася другая сустрэча Сымона і Ганны?

а) Сымон убачыў каханую ў лесе, яна спала.

б) Пасля ўцёкаў стомлены Сымон заснуў у лесе, і яго выпадкова ўбачыла Ганна, якая збірала суніцы.

в) Сымонка казаў Ганне, што прадчуваў сустрэчу, штосьці цягнула ў лес.

г) Яны сустрэліся ў хаце Ганны.

**8.** З чым параўноўвае лёс Ганны і Сымона аўтар, апісваючы іх другую сустрэчу?

а) з дзвюма каляінамі ў полі;

б) з дзвюма струнамі;

в) з птушкай каняй;

г) з дзвюма зоркамі;

д) з адзінокім дубам.

**ЧАЦВЁРТАЯ ЧАСТКА**

**1.** Пасля расстання з каханай адбылася яшчэ адна важная падзея на жыццёвым шляху Сымона:

а) ён сустракаецца, як было раней дамоўлена, у лесе з музыкам Галыгам, з якім пазнаёміўся яшчэ ў карчме;

б) выпадкова знаёміцца з леснікам – дзедам Данілам;

в) выпадкова сустракаецца з князем, які выехаў з іншымі панамі на паляванне.

**2.** Ці ўразіла паноў гранне хлопца? У чым гэта праявілася?

а) Так, вельмі, яны дзівіліся прыроднаму, самабытнаму таленту, былі нават зачараваны граннем.

б) Не, гранне Сымона іх не вельмі ўразіла, бо чулі і лепшае выкананне. А хлопца ўзяў з сабой князь толькі для пацехі.

в) Пан, уражаны талентам хлопца, падарыў яму срэбраны рубель;

г) Пан зняў з сябе сурдут і накінуў на плечы Сымону.

**3.** Шмат што пабачыў юнак па дарозе ў палац. Вызначце з ніжэйпрыведзенага шэрагу найбольш важныя праблемы, якія закранае аўтар:

а) раскоша, багацце адных і жабрацкае існаванне іншых;

б) сацыяльная няроўнасць, размежаванне на класы;

в) нацыянальная няроўнасць;

г) пераемнасць пакаленняў.

**4.** Якую заўвагу робіць вясковаму музыку княжацкі капельмайстар пан Галыга?

а) Што скрыпка, маўляў, не яго інструмент, яму лепш граць на мандаліне.

б) Пан Галыга быў вельмі ўражаны граннем, ніякіх заўваг не было.

в) Заўважыў, што бракуе тэхнікі выканання.

г) Галыга паказаў хлопцу нотную грамату (вельмі здзівіўшы яго) і сказаў, што гэтаму неабходна вучыцца.

**5.** Што магло ўтрымаць Сымона ў князя?

а) Прыгажосць палаца, раскоша, убранства.

б) Добрае, якаснае харчаванне, шыкоўная вопратка.

в) Спадзяванні на далейшую вучобу ў галіне музыкі, на дапамогу ў аваладанні нотнай граматай.

г) Хлопцы-музыкі, якім падабалася выкананне Сымона і якія моцна з ім пасябравалі.

**6.** Сымон захапляецца прыгажосцю старажытнага парку. Там ён аднойчы…

а) прыгадаў лес, дзе сустрэўся з любай Гануляй, яе самую;

б) сустрэў княжацкую дачку-прыгажуню, для якой граў на скрыпцы паланэзы;

в) ловіць матылёў і стракоз;

г) выпадкова сустрэў каханую Ганну.

**7.** Свет не без добрых людзей. Сымон моцна пасябраваў у замку з…

а) капельмайстрам Галыгам;

б) дзедам Данілам;

в) з княжацкай дачкой;

г) са студэнтам кансерваторыі.

**8.** Вартаўнік княжацкага парку дзед Даніла быў родам…

а) з-пад Вільні;

б) з-пад Кракава;

в) з Паволжа;

г) з-пад Мазыра.

**9.** Якім чынам апынуўся Даніла ў князя?

а) Князь, калі быў на Палессі, заўважыў яго здольнасці паляўнічага. Даніла добра выступіў на спаборніцтвах-турніры па стральбе.

б) Аднойчы на паляванні Даніла выратаваў князю жыццё, калі на князя ледзь не наваліўся мядзведзь.

в) Дзед Даніла быў раней княжацкім егерам, пастаўляў у замак розную дзічыну з Палесся. А калі пастарэў, застаўся ў князя.

г) Калі князь вандраваў па Палессі, на яго экіпаж напала зграя ваўкоў. Дзед Даніла якраз там паляваў, падаспеў на дапамогу і забіў важака зграі.

**10.** Што было агульнага ва ўспрыманні прыроды Сымонам і дзедам Данілам?

а) Абодвух ядналі спажывецкія адносіны да прыроды. Яны былі сялянамі і добра ведалі, што лес дае пушніну, драўніну, мёд і г. д.

б) Абодва верылі ў тое, што лес мае свой нораў, што пушчанскія нетры хаваюць розныя таямніцы.

в) Яны адухаўлялі лес, лічылі яго жывым.

**11.** Падчас размовы ў парку Сымон і Даніла разважаюць…

а) пра далейшую вучобу Сымона ва ўніверсітэце;

б) пра яго бацькоў;

в) пра таямнічыя гукі дзесьці ў нетрах пушчы – знакі будучых перамен;

г) задаюцца пытаннямі пра сацыяльную няроўнасць, размежаванне ў свеце на бедных і багатых.

**12.** Сымонка згаджаецца жыць у дзеда Данілы, таму што…

а) дзедава альтанка вабіла сваім экзатычным выглядам – партрэты, баявыя трафеі на сценах, даспехі, зброя на дыванах і інш.;

б) гэта ўтульная сялянская хата, звыклая Сымону;

в) Сымон быў салідарны са старэйшым сябрам – не хацеў жыць сярод чэлядзі, якая выслужваецца.

**13.** Даніла шмат цікавага распавядаў хлопцу:

а) у сцены замка маглі замуроўваць жывых людзей, каб будынак захоўваўся;

б) казаў, што ў сцены замка ўмураваны адмысловыя гаршчкі, каб падслухоўваць;

в) пра пахавальную працэсію, дзе ў труне манахі нясуць чыюсьці галаву;

г) пра чорных манахаў, якія носяць нейкі абраз;

д) пра Чорную панну, якая з'яўляецца разпораз замку.

**14.** У самым глухім кутку парку, за возерам, героі чулі…

а) таямнічыя гукі звона, што нібы склікаў народ на веча;

б) дзіўныя гукі, нібы хтосьці, нейкі таямнічы дрывасек сячэ лес – дрэвы ж застаюцца цэлымі;

в) чулі плач і лямант жаночы і дзявочы ад возера. То былі русалкі.

**ПЯТАЯ ЧАСТКА**

**1.** Гэтыя гукі прадказваюць…

а) хуткія перамены ў жыцці герояў;

б) блізкі канец свету;

в) хуткае вяселле Ганны і Сымона;

г) перамены, звязаныя з гістарычным лёсам беларускага народа;

д) хтосьці набліжае канец парку, замка, валадарання князя.

**2.** У пачатку 5-га раздзела Якуб Колас апісвае змаганне-бойку дзвюх стыхій: ветру і марозу. А мірыць іх…

а) сонца;

б) адзінокі сонечны прамень;

в) надыходзячая вясна;

г) ясны месячык.

**3.** У князя адбыўся баль і банкет. Запрасілі як музыку і Сымона. З якім вядомым творам можна параўнаць гэтую сцэну?

а) "Новая зямля" Якуба Коласа.

б) "Бярозка" Ядвігін Ш.

в) "Магіла льва" Янкі Купалы.

г) "Курган" Янкі Купалы.

**4.** Якую легенду-быль расказаў Сымон князю ў адказ на пытанне, пра штограў юнак?

а) Пра сваю гаротную долю выгнанніка з роднай хаты.

б) Пра прыгажосць княжацкага палаца і таямніцы парку.

в) Распавёў легенду пра жалудок, адзінага сыночка паміраючага дуба, які для пацехі, стрэліўшы, збілі з галінкі.

г) Легенду-паданне пра чароўнага асілка.

**5.** Якая прымаўка-выснова Сымона адрасавана панству?

а) Што пасееш, тое і пажнеш.

б) На чужы раток не накінеш платок.

в) Рэшатам вады не наносіш.

г) Хто зло-няпраўду сее, пажынае ліха.

д) Будзе і на нашай вуліцы свята.

е) Загляне сонца і ў наша аконца.

**6.** Колькі гадоў прабыў юнак у княжацкім палацы?

а) 10 гадоў;

б) 2 гады;

в) 3 гады;

г) 1 год і 6 месяцаў.

**7.** Хто звяртаецца да Сымонкі з іранічнымі словамі: "Ну, што скажа нам музыка, саматужны мой Шапен?"

а) князь;

б) княжацкі капельмайстар;

в) дзед Даніла;

г) бацька Сымона;

д) Ганна.

**8.** Пра якое жаданне дзеда Данілы ведаў Сымон?

а) Даніла хацеў узначаліць народнае паўстанне.

б) Хацеў разгадаць таямніцы замка.

в) Імкнуўся на радзіму: хацеў там знайсці апошні прыстанак.

**9.** У паэме ёсць водгулле нацыянальна-вызваленчай барацьбы, народных выступленняў супраць прыгнятальнікаў. Якія эпізоды, карціны твора сведчаць пра гэта?

а) Забойства князя.

б) Да Сымона прыходзіць пасланец ад Кастуся Каліноўскага, каб арганізаваць паўстанне.

в) Высветлілася, што дзед Даніла – паплечнік легендарнага Вашчылы і рыхтуе паўстанне.

г) Нябёсы сярдуюць, нібы выказваюць народны гнеў, насылаюць навальніцу з маланкамі на вежу княжацкага палаца.

**10.** Пра якога майстра ідзе гаворка ў наступных радках: "Тут цукровыя чароты, / Лісце буйнае дубоў, / Спелых нівак пазалота, / Сноп нажатых каласоў; / Тут пляцёнкі-завітушкі, / Стрэлы гонкія, шчыт, лук, / Тут і пер'е райскай птушкі, / І ўсялякіх многа штук..." (*Мароз.*)

**11.** Куды ўглядаецца Ганна, каб пабачыць сваё аблічча?

а) у люстэрка-трумо ў сваёй хаце;

б) у люстраную гладзь лясного возера;

в) у лужынку, што ў гаёчку;

г) у шыбку.

**12.** Да Ганны заляцаюцца, клічуць у жонкі. Хто і каму гаворыць наступныя словы: "Ой, глядзі, змяняеш быка, / Ды змяняеш на індыка. / Хіба зловіш ветру ў полі? / Вецер ветрам быў і будзе".

а) Ганна гаворыць Сымону, калі дазнаецца пра яго сустрэчы з дачкой князя.

б) Гаворыць ганарлівай дзяўчыне раззлаваны адмовай Дамянік.

в) Гаворыць маці Ганны.

г) Гаворыць Ганне заможны жаніх Кандрат.

**13.** Хто такі Дамянік?

а) Зух, рызыкант, ганарлівы хлопец, які жадаў зламіць волю Ганны.

б) Гэта, бясспрэчна, адмоўны персанаж. Ён хацеў пацешыцца з дзяўчыны, а потым кінуць яе. Але ж атрымалася, што ён закахаўся ў яе да вар'яцтва.

в) Дамянік – гэта малады паніч, які шчыра кахаў Ганну.

г) Гэта чараўнік, які прыняў аблічча Сымона, каб заляцацца да Ганны.

**14.** Да каго па дапамогу ідзе амаль звар'яцелы ад кахання Дамянік?

а) да бацькоў панскага роду, каб прызнацца ім, што пакахаў сялянку;

б) да княжацкага чарнакніжніка;

в) да вядомай варажэі – бабкі Аршулі;

г) да касцёла прасіць парады і дапамогі ў ксяндза Станіслава.

**15.** Што ўбачыў у час варажбы Дамянік?

а) Убачыў на вадзе, што Ганна падае руку таму, хто ідзе з лесу.

б) Убачыў у люстэрку сябе, забітага незнаёмцам.

в) Убачыў, як Ганна слухае скрыпача і пляскае ў далоні.

**16.** Дамянік цікуе за Ганнай, нарэшце падпільноўвае, гоніцца за ёй. Дзе хаваецца дзяўчына?

а) Паспела забегчы ў хату да маці і бацькі.

б) Схавалася ў дупле вялізнага дуба.

в) Да смерці напужаная дзяўчына схавалася ў жыце.

**17.** У чым прычына, хто вінаваты, што Ганна злякалася, цяжка захварэла, памутнеў яе розум?

а) Бабка-варажэя, што наслала на яе хваробу.

б) Сымон, што на доўгі час пакінуў яе.

в) Бацькі, якія хацелі выдаць дачку за нялюбага.

г) Дамянік, які моцна перапужаў дзяўчыну.

**18.** Што вярнула да жыцця Ганну?

а) Гарачае пачуццё да яе каханага Сымона.

б) Яшчэ адна варажба бабкі.

в) Вядомыя лекары, якіх паклікаў Сымон.

г) Ганна ачуняла пасля гаючага грання і спеваў Сымона-музыкі.

**Сяргей НЕСЦЯРОВІЧ,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі № 10 г. Гомеля.